# ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

**В. С. Забродская**

## ШЛЯХАМІ ПАЭТА КРАСЫ І ГАРМОНІІ: ДА 130-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. БАГДАНОВІЧА

Нарадзіўся Максім Адамавіч Багдановіч 27 лістапада 1891 года ў Мінску на вуліцы Аляксандраўскай, 25. Цяпер гэта вуліца Максіма Багдановіча, а на будынку, які знаходзіцца на месцы драўлянага дома размешчана мемарыяльная дошка, што сведчыць аб тым, што тут стаяў дом, дзе нарадзіўся вядомы паэт. Тады гэта быў двухпавярховы будынак, дзе на першым паверсе месцілася 1-е Мінскае пачатковае вучылішча, а на другім жыла сям’я Адама Ягоравіча Багдановіча, які з-за стану здароўя вымушаны быў змяніць пасаду загадчыка і настаўніка вучылішча і паступіць на службу ў сялянскі банк Гродна памочнікам бухгалтара. Таму яго сям’я ў ліпені 1892 года пераехала ў Гродна на вуліцу Садовую, дзе да гэтага часу знаходзіцца дом з мезанінам, мансардаю і зашклёнаю верандаю, мемарыяльная дошка на сцяне якога нагадвае, што паэт жыў тут у 1892–1896 гадах. Вясной 1895 года Багдановічы гасцявалі ў старэйшай сястры Марыі Апанасаўны – Стэфаніі – у маёнтку Вяззе (цяпер аднайменная вёска ў Асіповіцкім раёне), што прыкладна ў ста кіламетрах ад Мінска. У вёсцы ў 1984 годзе ўсталявана мемарыяльная дошка.

У кастрычніку 1896 года Адам Ягоравіч з дзецьмі пераязджае ў Ніжні Ноўгарад. Спачатку жылі на вуліцы Грузінскай (цяпер гэта дом нумар 32), у 1899 годзе пераехалі на Звяздзінку (дом там не захаваўся). Улетку 1899 года бацька, занепакоены здароўем сыноў (у Максіма былі яшчэ 2 браты – Вадзім і Леў), павёз іх у вёску Кара-Якупава (у былой Уфімскай губерні).

У пачатку верасня 1902 года Максім Багдановіч паступіў у Ніжагародскую мужчынскую гімназію. Першы літаратурны твор – апавяданне «Музыка» – з’явіўся на старонках «Нашай нівы» ў 1907 годзе, пазней былі надрукаваныя і вершы. У пачатку чэрвеня 1908 года Адам Ягоравіч перавозіць сыноў у Яраслаўль на вуліцу Ільінскую (дом не захаваўся). Максім вучыўся там у Яраслаўскай гімназіі, дзе наведваў літаратуразнаўчы гурток. 1 чэрвеня 1911 года скончыў гэтую гімназію, 2 чэрвеня аднёс дакументы ў Яраслаўскі юрыдычны ліцэй і вырашыў ажыццявіць падарожжа ў Вільню.

Улетку ж 1911 года паэт гасцяваў у Ракуцёўшчыне на Маладзечаншчыне, недалёка ад Краснага (раней – вёска Краснае сяло, цяпер непадалёк знаходзіцца чыгуначная станцыя Уша). Летам 1978 года на высокім пагорку былі ўстаноўленыя два вялікія камяні: адзін – завостраны, нагадвае свечку – своеасаблівы сімвал жыццесцвярджальнай паэтычнай творчасці, на другім размешчаны наступныя радкі: «У в. Ракуцёўшчыне ў 1911 годзе жыў і працаваў вядомы беларускі паэт Максім Багдановіч». 24 красавіка 1981 года бела-

рускімі пісьменнікамі быў закладзены мемарыяльны паэтаў сад: 70 дрэўцаў, што вызначаюць колькасць гадоў, што прайшлі ад 1911 (года знаходжання М. Багдановіча ў гэтых мясцінах). У 1991 годзе пачалі аднаўляць сядзібу, дзе гасцяваў М. Багдановіч. Так, у Доме арандатара і ў Доме гаспадара можна пазнаёміцца з музейнай экспазіцыяй, якая прадстаўляе нам быт стогадовай даўнасці. Ракуцёўшчыну называюць крыніцай натхнення паэта: там ім былі напісаны цыклы вершаў «Старая Беларусь» і «Места», паэмы «У вёсцы», «Вераніка».

У другой палове чэрвеня 1911 года Максім Багдановіч паехаў у Вільню, дзе пазнаёміўся з прыватнай калекцыяй беларускіх экспанатаў Івана Луцкевіча (пазней быў арганізаваны Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей І. І. Луцкевіча, які працаваў у 1921–1945 гадах): рукапіснымі кнігамі, старадрукамі, паясамі слуцкай мануфактуры Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі). Пабачыўшы гэтыя артэфакты, М. Багдановіч стварыў паэтычны цыкл «Старая Беларусь», вершы «Летапісец», «Перапісчык», «Кніга», «Слуцкія ткачыхі» і іншыя.

На пачатку 1914 года ў Вільні ў прыватнай друкарні М. Кухты на грошы Антона Луцкевіча і княгіні Магдалены Радзівіл накладам 2 тысячы асобнікаў выдадзены зборнік «Вянок» (гэта 120 старонак з 92 вершамі і 2 паэмамі).

У 1915 годзе М. Багдановіч едзе ў Маскву, каб знаёміцца з У. Пічэтам – даследчыкам беларускай гісторыі. Лета 1915 года паэт правёў на поўдні, у горадзе Стары Крым.

У канцы верасня 1916 года М. Багдановіч трапіў у Мінск, дзе гасцяваў у Змітрака Бядулі, які арандаваў дом на Малагеоргіеўскай вуліцы (зараз дом знаходзіцца на Рабкораўскім завулку, гэта філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча «Беларуская хатка»). Адметным экспанатам з’яўляецца ручнік, які сімвалізуе дарогу, што вяла паэта на Беларусь. На Крашчэнскай, 5 (цяпер – Інтэрнацыянальная, 31), дзе знаходзілася Мінская публічная бібліятэка імя А. С. Пушкіна (цяпер месціцца на вуліцы Гікала, 4), паэт спасцігаў асновы вершаскладання, тэорыю літаратуры. М. Багдановіч уладкаваўся працаваць у магістрат харчавання. Яшчэ адзін пункт, звязаны з працай паэта, – Ратамка, дзе ён разам з З. Верас, А. Смолічам, сёстрамі З. Бядулі наведаў прытулак для дзяцей-бежанцаў.

Зімой 1916 года прыбыў у Ялту, пасяліўся на вуліцы Мікалаеўскай, 8. У доме па гэтым адрасе перастала біцца яго сэрца ў 1917 годзе.

Як бачым, шмат дарог прайшоў паэт. Яго насычанае падзеямі жыццё і плённая творчасць да гэтага часу натхняюць пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў, якія ідуць шляхамі спасціжэння загадкі паэта, папаўняючы скарбонку багдановічазнаўства новымі матэрыяламі. Да кожнай юбілейнай даты, звязанай з імем творцы, з’яўляюцца кнігі, артыкулы, энцыклапедычныя выданні. Багдановічаўская тэма прыцягвае жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Яго творы паспяхова перакладаюцца на розныя мовы свету. На словы вершаў паэта напісаны рамансы, оперы, шматлікія песні, якія здзіўляюць сваёй меладычнасцю. Яму прысвечаны таксама і дакументальныя фільмы.

З 1 красавіка 1981 года ў Мінску дзейнічае Літаратурны музей М. Багдановіча, дзе ёсць экспанат з самой Ялты – пальма. У музеі падрыхтаваны пазнавальныя экскурсіі, ладзяцца таксама і шматлікія літаратурныя вечары, на якіх гучыць неўміруючае слова паэта, які ў кожным імгненні свайго жыцця шукаў і спасцігаў красу і гармонію існавання чалавека на Зямлі.